


# ЧАЛАВЕК НЕ АРЭХ, НЕ АДРАЗУ РАСКУСІШ

Мусіць, кожнай істоце ўласціва любіць сваіх бацькоў, але каб так...

Некалі ў невялікім пакойчыку заводскага інтэрната нас было трое: Віця, так званы ўсходнік, я, заходнік, і трэці, Эдзік, — ці не паляк, бо маці яго звалі, здаецца, Станіслава Браніславаўна (а можа, Браніслава Станіславаўна — я ўжо забыўся). А вось бацьку — дакладна помню — дзядзька Збысь, Збышак, а паўней — Збігнеў Казіміравіч. Факт, што сын іх амаль кожны вечар расказваў, якія яны разумныя, якія добрыя да гасцінныя... І амаль кожны з гэтых маналогаў завяршаў словамі: «Я вас пазнаёмлю! Усё, летам, на два выхадныя мы конча паедзем!»

Далей ішло падрабязнае апісанне іх хутара, хаты, гаспадаркі, лесу, рэчкі, лазні і іншых даброт, якія нас там чакаюць.

Нельга было не ехаць.

І вось мы, трое хлапцоў (Віця дык нават з нявестай), выбраліся ў дарогу. Транспарту свайго ніхто з нас тады не меў, таму калыхаліся спярша на цягніку, потым — у аўтобусе, потым вёрст пяць ішлі пехатой...

Затое на месцы нас і сапраўды чакаў прасторны, утульны дом, гатовая лазня, накрыты стол. Што на ім было, расказаць цяпер не бяруся, але ж на той час (ды пасля лазні) анічога смачнейшага я не еў. Выпіўка таксама была, не без таго, але ж болей смеху ды нейкіх размоў: не заўважылі, як сцямнела.

— Самы час пакупацца, — сказаў раптам Эдзік. — Гайда на ставок.

Мы з Віцем пераглядзелі на яго вялікімі вачамі, але згадзіліся. Светка, тая нявеста, — не, пайшла адпачываць.

І правільна зрабіла, бо мы без не паплавалі голяком, у цёплай чыстай вадзе, пад зоркамі! Кайф невыказны!..

Потым мы выціраліся вялікімі ручнікамі, грэліся ля вогнішча, зноў купаліся.

Ужо на досвітку прыйшлі дахаты, але ж, як ні стаміліся, заснуць не змаглі, бо побач, за тонкай перагародкай, сталі сварыцца маладыя. Света ўсё гучней і гучней некуды пасылала нашага сябрука, а той хіба што ўмольна пытаўся: «Ну падумай, куды я пайду? Я ж тут нічога не ведаю. На двары яшчэ цёмна... Можа, раніцай?» «Не! Я сказала зараз, значыць, зараз ідзі!» — на сваім стаяла маладзіца.

— Куды ты яго пасылаеш? — пастукаўшы ў дзверы на правах гаспадара спытаў Эдзік.

— Туды, адкуль прыйшоў... На сажалку! — з выклікам адказала Света.

— Чаго?

— Разумееш, — мямліў Віця, ужо выйшаўшы з пакоя, — я там недзе трусы пакінуў... Ці па дарозе згубіў. Вось яна і ўзнялася. На ложак не пускае. На падлозе таксама легчы не дае...

Што было рабіць? Усе ўтраіх мы падаліся на рэчку: абышлі бераг, месцамі абмацалі кусты. І якраз на іх знайшлі тую прапажу!

Карацей, потым было пра што пагаварыць, было з чаго пасмяяцца!

І як бы між іншым пачуць ад дзядзькі Збышка, што Света — дзяўчына, вядома, прыгожая, але з-за трусоў гэткі вэрхал падымаць, мусіць, ёй не трэба было?..

І ехаць з намі таксама. А то, бач, ультыматум Віцю паставіла: альбо са мной, альбо наогул не паедзеш...

Іншыя яе «выверты», мусіць таксама ў памяці ўсплылі. А следам — такі ж спала заслона з вачэй сябрука: недзе праз месяц яны са Светай рассталіся.

Што было потым?

Віця з нашай тройкі ажаніўся апошнім, але жонка ў яго — якіх пашукаць! Мы яму не раз пра гэта казалі.

А ён тады ўзгадваў нашу паездку на хутар і дзядзьку Збышка. Маўляў, калі б не ён, не меў бы я шчасця.

Так гэта ці не так?

Ва ўсякім разе Свету яго мы неяк знайшлі ў «Аднакласніках». Яна па-ранейшаму добра выглядае, мае дваіх дзяцей, праўда, ад двух мужоў. Цяпер шукае трэцяга.

**Павел К.,**

*г. Мінск.*

# СЫРОВАТКА З... ГРАДУСАМ

Чаго толькі не баюць гумарысты пра нашы спіртзаводы! Маўляў, не прадпрыемствы гэта, а нейкія «чорныя дзіркі»: і экскурсіі там знікаюць, і камісіі блудзяць... Кшталту — калі трапіў туды, то з канцамі. Назад нават святло не вяртаецца, не тое што фізічныя целы!

А зрэшты, яно і зразумела — *спіртзаводы*. Там, відаць, па азначэнні павінны быць і маленькія зялёныя чалавечкі, і белыя коні, і лятаючыя талеркі, і іншыя таямнічыя з'явы...

Але ж я хачу расказаць пра завод малочны. Ды яшчэ і які: флагман айчыннай вытворчасці, прадпрыемства агульнасаюзнага значэння і зноў жа агульнасаюзнай вядомасці, якую прынесла яму яго ж прадукцыя — славутая Рагачоўская згушчанка.

Не, пры яе вытворчасці ніхто, дзякаваць Богу, не блудзіў і не знікаў. Дысцыпліна была жалезная: у прыватнасці, колькі чалавек праз прахадную заходзіла, столькі ж потым выходзіла. І пакуль тая змена ішла, усё працавала, нібы швейцарскі гадзіннік...

Але ж вось, як у песні, «пропел гудок заводской, конец рабочего дня», і людзі кіруюць да прахадной. Што дзіўна пры гэтым — не ўсе цвярозай паходкай. Горш за тое, ад асобных нясе, як ад цэбра з брагай. Калі паспелі? Што пілі? Дзе?

Начальства стамілася строіць здагадкі, ахова даўно ўжо збілася з ног, варта, можна сказаць, зямлю носам рыла. Глядзелі: можа, хтось тое «зелле» праз прахадную праносіць? Не. Цераз агароджу перакідвае? Таксама не...

Адно заўважылі — тыя мужыкі, ад якіх, мякка кажучы, алкаголем патыхае, на прахадной з'яўляюцца неяк не адразу пасля «гудка»: позняца крыху.

Узяліся сачыць, дзе канкрэтна затрымліваюцца (камер відэаназірання тады не было). І такі ж знайшлі! Таямнічай «чорнай дзіркай» аказалася — не паверыце — звычайная малочная біклага.

Адкуль там узяліся «градусы»? Ды проста: у 80-я гады мінулага стагоддзя спіртнога было не дакупіцца: «даставалі» хто дзе мог, а хто не мог, — варыў бражку, гнаў самагонку.

Вось спецыялісты, якія на малочным заводзе варылі слынную згушчанку, і падумалі: а што, калі ўзяць біклагу, наліць туды сыроваткі (там яе — хоць заліся), дадаць пэўную колькасць цукру, дражджэй ды паставіць у цёплае месца?

Як паказаў вопыт, праз тыдзень (ведама ж, кампаненты якія!) атрымаеш не бражку, а чысты нектар! І смак там, і карысць, і ў галаву дае — не параўнаць з «пладова-ягадным». Нават жанкі прыходзілі той прадукт паспытаць, бо смачна (гэта мужыкам важней, каб у галаву давала)...

Вось і стаялі ў закутку дзве біклагі. З адной вузкае кола «вынаходнікаў» піло тую смакату, другая — «выспявала», потым наадварот. Бо чалавек, у якія ўмовы яго ні паставілі б, выйсце знойдзе.

А ўжо наш чалавек, як кажа Задорнаў, і пагатоў.

**Соф'я КУСЯНКОВА,**

*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

# КАХАННЕ І КЛУБНІЦЫ

...Хто ў дзяцінстве, жывучы ў вёсцы альбо прыязджаючы туды на канікулы, не лазіў у чужыя гароды, у чужыя сады?! Мусіць, няма такіх. Вось і ў нашым падлеткавым асяродку гэта лічылася ледзь не подзвігам. А ўжо калі гаспадар таго саду ці гаспадыня агарода браліся сваё дабро пільнаваць, то і пагатоў.

Дык вось гэтая гісторыя адбылася недзе ў канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя і было ў ёй усё: і цёплая зорная ноч, і юнацтва, і ўласцівае яму першае каханне, якое кружыла галовы, і... новая кашуля.

Так-так, гэта цяпер абновай нікога не здзівіш і не дужа дзяцей парадуеш. А тады... Купля кожнай новай рэчы была падзеяй, асабліва ў сем'ях з невялікім дастаткам: як у Максіма, напрыклад, бо, апроч яго, там яшчэ чацвёрка жэўжыкаў падрастала. І ўсіх жа трэба было накарміць, абуць, апрануць... Бацькі з усіх сіл стараліся.

Праўда, Максім, старэйшы з сыноў, ужо дапамагаў ім, і не толькі па гаспадарцы: летам ён працаваў у калгасе. Вось матуля і захацела яго адзначыць, парадаваць новай адзежынай.

Хлопец яе прымераў, паглядзеўся ў люстэрка — вунь які дарослы, прыгожы! Дачакацца б вечара...

Вечар у яго і праўда пачаўся выдатна: хлопцы кідалі на Максіма зайздросныя позіркі, на яго ж, ды ў новай кашулі, з цікавасцю пазіралі дзяўчаты, а галоўнае — менавіта яму шчыра ўсміхалася тая, адзіная, дзеля якой прыбраўся...

Бліжэй да поўначы яны засталіся ўдваіх. Спачатку, седзячы поруч на лавачцы, пра нешта размаўлялі, потым — «лічылі зоркі», потым дзяўчыне захацелася клубніц.

Падумаеш... Максім, ачмурэлы ад шчасця, мог бы, здаецца, брыльянтаў дастаць, не тое што ягад! А таму без лішніх разваг ён куляй сiгануў у найбліжэйшы гародчык: там, у старой Карабаніхі, даспявала цэлая плантацыя салодкіх ягад.

І якраз таму, відаць, гэтая бабуля па начах не спала!

Пачуўшы каля плота незразумелы шоргат і рух, яна з крэктам выпаўзла з хаты і пачала «азіраць» свой агарод, асвятляючы яго ліхтарыкам.

Максім быў гатовы даць лататы — назад, цераз плот, бо жменю ягад ужо нарваў, але ў апошні момант яму неяк страшна стала. Падумаў, а раптам бабуля пазнае яго — ужо, лічы, кавалера, раптам заўтра пойдзе да бацькоў і раскажа?

А таму неспадзеўкі, нават для сябе хлопец... упаў на жывот і па-пластунску папоўз па баразёнцы (плантацыя клубніц межавала з плантацыяй бульбы).

Поўз ён ціха і асцярожна, каб бабуля не ўбачыла, але ж пры гэтым вельмі спяшаўся, таму ягады «па дарозе» падушыліся і пагубляліся. Горш за тое — на сваю новую кашулю, на порткі, на рукі Максім назбіраў нямала гразі...

Факт, што спэцканым, мокрым, ды яшчэ і без ягад, вярнуцца да каханай ён не мог. Паспрабаваў быў у нейкай лужыне спехам адмыцца, але толькі горай зрабіў...

А тую з-за плота, як злодзей, ён нейкі час пяглядаў...

Пяглядаў, як найлепшая з дзяўчат сядзіць адна, як чакае яго і нервуецца, як, вядома ж, крыўдзіцца і ідзе дамоў...

Вось так, можна сказаць, не пачаўшыся, скончылася іх каханне — з-за клубніц.

...Напэўна, таму Максім не есць іх? Якімі б смачнымі яны ні былі. Аж дагэтуль.

**Святлана МАГІЛЕЎЧЫК,**

*Бялыніцкі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*

■ Сацыяльная кансультацыя

# ФІРМА РАЗВАЛІЛАСЯ. ЯК МНЕ НАЛІЧАЦЬ ПЕНСІЮ?

***У гэтым годзе выходжу на пенсію. Сутыкнулася з такой праблемай: справа ў тым, што фірма, у якой я працавала з 1989-га па 1993 год, развалілася. У архівах ніякіх звестак пра яе няма. Дзе мне шукаць гэтыя гады працы? І якім чынам будзе ўлічвацца мая праца ў гэтай фірме пры прызначэнні пенсіі?***

**Валянціна МАКАРАВА,**

*г. Мінск*

**На пытанне нашай чытачкі адказвае начальнік аддзела прызначэння і выплаты пенсій і дапамог упраўлення пенсій і дапамог Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ала КОЛБІК:**

— Для вылічэння памеру пенсіі на сённяшні дзень асноўнымі з'яўляюцца два параметры — гэта працягласць стажу працы і велічыня заробатнай платы, якую чалавек атрымліваў да выхаду на пенсію. З ліста ў рэдакцыю дакладна незразумела, які з гэтых параметраў неабходна пацвердзіць, таму пагаворым пра абодва варыянты.

Такім чынам, што тычыцца стажу: асноўным дакументам, які пацвярджае стаж працы, з'яўляецца працоўная кніжка. Таму калі ў працоўнай кніжцы запіс аб перыядзе працы ў гэтай арганізацыі занесены як належыць, гэта значыць у адпаведнасці з інструкцыяй аб парадку вядзення працоўных кніжак, то ніякіх дадатковых дакументаў для пацвярджэння перыяду працы не патрабуецца. Што значыць «як належыць»? Няма выпраўленняў, памылак, запіс завераны подпісам і пячаткай наймальніка.

Калі запіс аб працы не адпавядае патрабаванням інструкцыі па вядзенні працоўных кніжак, то ў такой сітуацыі неабходна даведка аб перыядзе працы, якая павінна выдавацца на падставе дакументаў таго перыяду. Калі арганізацыя ўжо ліквідаваная і дакументы не здадзены на захоўванне ў архіўныя ўстановы, то пацвердзіць перыяд працы можна толькі на падставе паказанняў сведак.

Для гэтага чалавеку неабходна звярнуцца ў камісію па прызначэнні пенсіі, якая ўтвараецца адміністрацыяй таго раёна, дзе ён пражывае. Стаж пацвярджаецца на падставе паказанняў не менш як двух сведак, якія ведаюць заяўніка па сумеснай працы ў гэтай арганізацыі. Сведкі, у сваю чаргу, павінны мець дакументы аб сваёй працы за ўвесь той час, у дачыненні да якога яны сведчаць.

Але, хутчэй за ўсё, у гэтай сітуацыі ў Валянціны Макаравай паўстала пытанне, звязанае з падачай даведкі аб заробатнай плаце, неабходнай для прызначэння альбо пераразліку пенсіі.

Справа ў тым, што даведка аб зарплаце да 1 студзеня 2003 года, якая падаецца для вылічэння пенсіі, выдаецца працадаўцам на падставе дакументаў аб налічанай і выплачанай заробатнай плаце. У выпадку, калі працадаўца спыняе сваю дзейнасць, такая даведка выдаецца яго праваправаемнікам, альбо архівам, альбо органам, які ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю юрыдычных і індывідуальных прадпрымальнікаў, альбо арганізацыяй, у якой знаходзяцца на захоўванні бухгалтарскія дакументы.

Як мы бачым, арганізацыя ліквідаваная, праваправаемніка не існуе, дакументы на захоўванне ў архіўную ўстанову не здадзены. У такой сітуацыі ўстанавіць звесткі аб памеры заробатнай платы можна толькі ў судовым парадку.

Гэта значыць, чалавек павінен звярнуцца ў суд для ўстанаўлення заробатнай платы ў пэўным памеры за канкрэтны перыяд. Суды пры такой катэгорыі спраў прымаюць любыя сродкі доказвання, прадугледжаныя ў грамадзянскім судаводстве. Напрыклад, памер зарабку можа быць пацверджаны дакументамі, якія ўскосна сведчаць аб фактычным зарабку. Магчыма, гэта нейкія выпіскі з штатнага раскладу, укладышы ў працоўную кніжку, разліковыя лісткі, калі яны захаваліся, альбо нейкія іншыя доказы. У тым ліку суд прымае да ўвагі паказанні сведак. Калі суд знаходзіць падставы для ўстанаўлення зарплаты, ён выносіць рашэнне, якое пасля яго ўступлення ў законную сілу прымаецца органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароны ў якасці пацверджання зарабку для вылічэння пенсіі. Гэта значыць, рашэнне суда для нас з'яўляецца такім жа дакументам, як і даведка аб заробатнай плаце.

Калі суд не зможа прыняць рашэння і гэты перыяд трапляе ў перыяд для разліку каэфіцыента зарабку, то заробатная плата будзе прынята ў якасці нулявой.

Хачу адзначыць, што на сённяшні дзень мы сутыкаемся з досыць вялікай колькасцю сітуацый, калі памер зарплаты ўстанаўліваецца ў судовым парадку. Як правіла, нашы суды знаходзяць падставы для ўстанаўлення зарплаты і прымаюць неабходнае рашэнне.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

**НА ЗАМЕТКУ**

**Асноўныя параметры для вылічэння памеру пенсіі — працягласць стажу працы і велічыня заробатнай платы, якую чалавек атрымліваў да выхаду на пенсію. Чым вышэйшыя гэтыя параметры, тым большы будзе памер пенсіі. Максімальны стаж, які ўлічваецца для жанчын, складае 40 гадоў, для мужчын — 45 гадоў. Максімальны каэфіцыент зарабку, які ўлічваецца, складае 4,0.**